Чалавеку
АК
ўласцівa...

Анатоль Кірсель

Чалавеку ўласціва...

вершы і мініяцюры ў прозе

Мінск

1996

ББК 84.(4Беи)6
К43
УДК 882.6-8

Кірвель А.
К43 ЧАЛАВЕКУ ЎЛАСЦІВА: Вершы і мініяцюры ў прозе.– Мн.:
1996.– 96 с.

Новая кніга вершаў і мініяцюр у прозе Анатоля Кірвеля – працяг той размовы з чытачом, якая пачалася яшчэ тады, калі пабачыў свет першы зборнік аўтара – „УРБАНІЯ" (Мн.:Маст. літ., 1995).

Як жыццё рухасцца па спіралі, падымаючыся штораз на новую, вышэйшую ступеню, так і аўтар, закранаючы бсзумоўна знаёмыя ўсім жыццёвыя праблемы, разглядас іх з новых пазіцый – з большай патрабавальнасцю як да сябс, так, врагодна, і да чытача…

К8820600000

© А.М. Кірвель, 1996
© М.Г. Васільеў,
афармленне, 1996

Новая Беларусь —
якой яна будзе ў новым
тысячагоддзі?
З чым мы прыйдзем у яго —
застанемся такімі,
як былі,
ці зменімся?
Незалежная творчая
асацыяцыя аматараў
прыгожага пісьменства
„Новая Беларусь" —
ваш памочнік і дарадца
ў спробе адказаць на гэта,
пагадзіцеся, няпростае
пытанне.
Вашай увазе прапануецца
новая кніга беларускага
пісьменніка
Анатоля Кірвеля,
які жыве і працуе
ў Санкт-Пецярбургу.



НОЧ ПАКУТНІКА

„ ... мне здавалася, што ў пэўныя
хвіліны жыццё маё
робіцца надзіва
значным і набывае
рэдкі і вельмі
каштоўны сэнс."

Ж. П. Сартр

Ноччу прыходзяць самыя лепшыя –
самыя цвярозыя – думкі.
Сон – вораг цвярозасці.

* * *

Жыццё – такое кароткае.
А памяць – пакутліва доўгая,
калі жыццё – узор для пераймання.

* * *

Стамляе не мудрасць.
Стамляе безнадзейнасць.
Маладосць не ведае стомы:
нашто ёй лішнія клопаты:
тое, што непазбежна –
хай прыходзіць у свой час –
час сталення.

* * *

Бяры тое, што ёсць: лепшага табе не дадуць.
Лепшае – у табе самім.
Калі ты – не з горшых.

* * *

Гарчэй няпраўды – толькі бяссілле.
Перад тым, што ведама толькі табе.

* * *

Сонца свеціць усім аднолькава.
Ды не ўсім аднолькава грэе:
у аднаго на галаве шапка,
у другога – лысіна.

* * *

Цярпенне – гэта сіла.
Сіла – гэта прымус.
Прымус – гэта знявага.
Цярпенне – знявага самога сябе?

* * *

Тое, што дадзена табе, дадзена ўсім.
Але камусьці гэтага мала,
камусьці многа.
Аддаць таму, каму мала?
Мяркуеш: як аддасі – дык страціш.
Мяркуючы – страчваеш.

* * *

Святасць – не ў аскезе.
Святасць – ва ўсведамленні,
што аскеза – грэх наадварот:
грэх супраць самога сябе.

* * *

Сцеражыся ведаў:
яны памножаць твае пакуты.
Не пазбягай ведаў –
ратунку ў веры пакут.

* * *

Пошукі ісціны – занятак для тых,
хто згубіў жыццёвы кірунак.
А хто яго не меў?

* * *

Чаканне – найлепшыя лекі.
Калі маеш надзею.

* * *

У кожнага пітка – сваё пітво.
Чыё лепшае?

* * *

Цвярозым быць нецікава:
ад цвярозасці –
галава не кружыцца.

* * *

Сны пакутніка – сны забойцы:
няма сладчэй атруты,
чымся мроі.

* * *

Насіць у сабе боль – цяжка.
Насіць у сабе радасць –
ці доўга праносіш?!
Згрызуць!

* * *

Не ўсё даецца лёгка.
Цяжэй за ўсё – лёгкасць.

* * *

Не шкадуй сябе. Шкадуй суседа:
ніхто лепей за яго не падкажа табе,
як не трэба жыць.

* * *

Святло прыходзіць тады,
калі пераступаеш мяжу цемры.
Святло – стамляе, цемра –
выратоўвае.
Таго, хто праз яе прайшоў.

* * *

Не хваліся снамі. Сны – падарунак.
Да свята, якое яшчэ не прыйшло.

* * *

Чакай, спявай, любі! – нічога
не забаронена.
Забаронена: не чакаць, не спяваць, не любіць.

* * *

Помста – нож, якім ты самаруч
адразаеш кавалкі ад свайго жыцця,
якія ўсмак таму, каму ты помсціш.

* * *

Шукай тое, чаго ты дагэтуль не ўмеў рабіць.
Бо тое, што ты не ўмееш рабіць, –
крок да Аіда.

* * *

Не зробіш – не зразумееш.
Не зразумееш – не падкажаш:
самому сабе.
У той момант, калі ніхто падказаць не здольны.

* * *

Бегчы ад сябе – дарэмна.
Калі і бегчы – то да радасці.
Лепей за ўсё – не аднаму, а ўдвох:
той хто побач,
ведае шлях напэўна лепей, чым ты –
гэта і ёсць надзея.
Твая.
А ягоная – у табе!
Пабеглі?

* * *

Вядзьмаркі – не тыя, хто нас зводзіць.
Вядзьмаркі – тыя, хто нас
заварожвае.

Мроямі.

* * *

Мроі – гэта надзея. Апошняе, што памірае ў чалавеку.
А чалавек?

* * *

Агонь у печы – сяброк адзіноты.
Але і сябры здраджваюць – згараюць.
Жадаючы гарэць толькі сваім агнём.

* * *

Жыццё – штодзённыя пошукі. Уцехаў, асалоды, славы.
Калі меў усё гэта – ты пражыў жыццё
ці не?!
Ці проста карыстаўся тым, што табе давалі?

* * *

Знайдзі свой голас. Зрабі яго сваім.
Тады ён не будзе для цябе чужы.

* * *

Востраў – гэта адзін асяродак,
абмежаваны другім.
Душа – гэта востраў ці адзін з
прыкладаў абмежавання?
Ад таго, што непадуладна табе.

* * *

Каляровыя сны – свавольства
падсвядомасці.
Амаль гэткае, як і ласка, на якую ты
нават і не разлічваў.

* * *

Не вер мроям. Мроі – пагібель, калі
ты – не музыка.
Каб сыграць мроі так, каб яны
засталіся мроямі,
не шукай арган – дастаткова жалейкі.

* * *

Адзінота – знямога.
Адзінота – ратунак.
Адзінота – тое, што патрэбна толькі
аднаму.
Там, дзе двое, – там альбо еднасць,
альбо нянавісць.

* * *

Адзінота лечыць і тую душу, якая
ненавідзіць,
і тую, якая даруе.

* * *

У адзіноце – лягчэй дараваць:
зло не стаіць перад вачыма –
не вымагае зла ў адказ.

* * *

Стаяць на месцы – асалода хіба для
слупа.
А калі ты – не слуп?

* * *

Прымушаць рухацца – нельга.
Лепей даць свабоду – свабоду ісці!

* * *

Ісці разам ці аднаму?
У гурце ці супроць гурту?
Калі як: і адзін, і ў гурце –
доўга не пройдзеш –
стомішся.
Ратунак ад стомы – дарога,
па якой ніхто не ішоў.

* * *

Пекла – не страшнае.
Страшней – уяўленне пра пекла.

* * *

Мець за ратунак руку сябра можна толькі двойчы.
Адзін раз – калі спаткнуўся ён,
другі – калі спаткнуўся ты.
Хапацца за руку ў трэці раз –
зневажаць і сябе, і сябра.

* * *

Калі дровы згарэлі, чакаць, што яны ўспыхнуць зноў –
дарэмна: першай на папялішчы
вырастае адно надзея, і толькі
потым – трава, а ўжо за ёй – дрэвы, якія некалі пойдуць
на дровы.

* * *

Смерць прыходзіць не тады, калі яе чакаеш, а тады,
калі ёй зручней.

* * *

Пошукі радасці – пошукі дылетанта.
Радасць не шукаюць – ёю жывуць!

* * *

Перамагчы сябе можна толькі пры адной умове:
калі ёсць што перамагаць.

* * *

Лёс не бывае няўдзячны.
Часцей за ўсё – ён справядлівы.

* * *

Ноч пакутніка – ноч жывога
чалавека.
Мёртваму – ужо не баліць.

пустыя



гнёзды

"Туга будзе вечнай", —
за хвіліну
да смерці
запэўніў

Вінцэнт ван Гог.

Бяздонне – цемень.
І калі, спатыкнуўшыся,
мы падаем у яго –
спазнаем часцінку Цемры.
Ці варта так часта падаць,
каб спазнаць яшчэ штосьці?
А як не хопіць сілы падняцца?

* * *

Справе, якую ты робіш,
трэба аддаваць душу.
Чыю?

* * *

Што ёсьць Бог?
Што ёсць жыццё?
Хто мы – вылюдкі ці недаробкі?

Куды мы пойдзем?
Туды, куды нас павядуць,
альбо туды,
куды мы самі ўшчэмімся –
з вялікага розуму?

* * *

Угнуць галаву ў плечы,
ці не шкадаваць яе,
добра ведаючы,
на што ідзеш?
Або схітрыць і проста дачакацца,
калі ўсё само прыйдзе табе ў рукі?

* * *

Лаюць – палітыкаў.
Не лаюць – адно геніяў.
Тыя, хто пасярод іх –
генії ці палітыкі?

Пісаць і піць гарэлку –
занятак амаль што Боскі:
на тое і на другое патрэбна
ўмельства.
Ды без самаахвярнасці –
ні пісьменніка добрага, ні пітка.
Бач як! Сродкі – аднолькавыя,
а вынік?

* * *

Хіба спыніцца жыццё – без нас?
Спыніцца – замарудзіцца – рост:
зерне, якому радзіць, –
ператворыцца ў гной.
Хіба мы, не нарадзіўшы нічога, –
толькі гной?

Прыгажосць – сродак ці
празмернасць?
Або сляпы ліхтар, які свеціць
сляпому
нават уначы?

* * *

Колькі адпушчана мне?
Колькі адпушчана табе?
Калькі ўсім нам?
Калі ж мы спынімся –
задаваць сабе гэтыя пытанні?

* * *

Пытанні, на якія няма адказу, –
што гнёзды без птушак:
ці то каршун вынішчыў,
ці то сяброўка не стрэлася,
каб сямейку зладзіць?

Любіць – не любіць?
Кахаць – не кахаць?
Жыць альбо паміраць?
Ці проста верыць, што кветка,
якую ты пасадзіў, – твая?

* * *

Хто ўсміхаецца першы:
шчаслівы? разумны? прадбачлівы?
Альбо той, хто часцей аддае –
ніяк у яго не менее?

* * *

Адчай выратоўвае слабага.
Упартасць – моцнага.
А калі ты яшчэ не спазнаў,
што такое адчай, ты – моцны?

Мы не адкрываем нічога новага.
Мы толькі называем, як ёсць цяпер.
Хіба гэта прасцей, чым адкрываць
новае?

* * *

Пругкія грудзі, запал маладосці –
усё гэта ператворыцца некалі ў тлен.
Але пакуль не ператворыцца –
камусьці будзе гэтага не хапаць.
І ён будзе маліцца, каб так
заўсёды было.
Хіба ж мы – іконы?

* * *

З Богам трэба дзяліцца.
Найперш – радасцю ды ўдачай.
Хіба Васпану чаго не хапае?
Але ж і ад цябе не ўбудзе.
Спрабаваў?

Чалавек павінен быць добрым.
Павінен быць чулым і спагадлівым.
Хіба ён вінаваты, што так многа вінен?

* * *

Сцеражыся сяброў: яны спакушаюцца
на тое,
без чаго нельга жыць – без даверу.
А як скарыстаеш увесь –
то паміраць?

* * *

Пасядзець з алкашом –
паслухаць гісторыю,
якую без слёз не раскажаш.
Але ці будзеш слухаць яе
са слязамі на вачах?

Стварыць цемру вакол сябе –
прасцей за ўсё.
Разагнаць яе – Сізіфава праца.
Няўжо яна дарэмная?

* * *

Лісток восеньскі,
што лёг неўспадзеў на плячо –
ці не згадка лёсу твайго?
Падымі, прачытай –
літары, мусібыць, не чужыя?

* * *

Бацькаўшчына – хіба не тое,
куды мы вяртаемся,
як птушкі з выраю?
А гнёзды – цэлыя?

Нашто нам прыгожае
пісьменства?
Ці памагае яно жыць?
Ані!
Дык мо не пісаць?
Але ж усе мы – як сырая гліна,
а пісьменства – ганчар,
што душы нашыя лепіць.
Адно не тых, хто цяпер жыве – не
дарослых;
яны паперад злепленыя – не намі, – а
тых,
хто потым жыць будзе – дзетак нашых.
Гадоў праз сорак і адгукнецца слоўца,
лёгенька – ад сэрца – прамоўленае.
Пісацьме?

Здабытак – ужытак.
Ужытак – звычка.
Звычка – асоба.
Асоба – здабытак?

* * *

Прыгажосць уратуе свет.
А што яго знішчыць?
Простасць? прымітыў?
Няўжо геніяльнае –
заўсёды такое простае?

* * *

Квадрат – непакоіць.
Кола – суцішае.
Тое, што бачыць вока – аж да
гарызонта – палова кола, палова
суцяшэння. А дзе другая?
Ці не ў царкве, дзе няма квадратаў,
і дзе над табой – другія палавінкі колаў –
каменныя аркі?
Дык што лечыць душу: вера ці вока?

Пытанні без адказаў – гнёзды,
куды прыляцяць птушкі.
Калі?

* * *

Што меней важыць: смутак або
радасць?
Меней важыць тое, што лягчэй
забываецца.
А калі ты забыўся,дзе рос?

* * *

Шанаваць сябе,
ці шкадаваць сябе?
Шкадуючы – шануй!
Шануючы – даруй!

Хіба плачуць з гора?
Слязамі – ачышчаюцца.
А калі чысціня – праз пакуты?
Гэта – радасць ці лёс?

* * *

Шчасліва ўсміхацца –
доўжыць свой век.
Доўжыць век –
доўжыць пакуты?

* * *

Варта закрэсліць сябе адзін раз –
і ўсе вінаватыя, што ты такі нешчаслівы.
Хто прымушаў цябе браць у рукі алавак?

Стварыць Пекла – у сваёй хаце –
здольны не кожны.
Стварыць Рай – тым больш.
Стварыць тое і другое разам
і парадавацца, што стварыў адзінае,
на што здольны – стварыў Жыццё?

* * *

Прыгажосць – плата.
А як няма чым плаціць?

* * *

Сцісласць – сястра таленту.
А калі ён – усеабдымны?

Адпавядаць узросту –
адпавядаць ісціне.
Ісціна – гэта вынік ці
адпаведнасць?

* * *

Зірні ўглыб – убачыш мяжу.
Зірні ўгору – не знойдзеш межаў.
Зірні ў сябе – і не палохайся:
там усё наадварот:
глыбіня не мае межаў,
а ты – не анёл.
А калі ў цябе прарастаюць крылы?

Вароны жывуць і ў горадзе, і ў полі.
У горадзе яны называюцца гарадскімі
варонамі,
у полі – вясковымі.
Тыя, каго так называюць,–
ці не белыя вароны –
самыя рэдкія
і самыя ранімы птушкі?

* * *

Лістота восеньская – валасы каханай
–
сховішча для пяшчоты і таемнага
сораму:
табе – недарэку! – цэлае бярэмя
шчасця!
Ці не грэх: гэтулькі – ды аднаму?



Кляновы ліст – як птушка забітая –
распасцёршы крылы –
нячутна скрозь голле –
ажно сэрца замірае – зараз ціўкне ад
болю.

* * *

Ходзяць людзі – прамаўляюць сваё.
Ў раптам – нібыта знарок – кажуць
тое,
што ты і сам хацеў бы сказаць.
Ў словы тыя – з чыстага золата.
А яны ім – як смеццем.
Як здарылася, што не ты, а яны?
А мо гэта ты перасяліўся ў іхняе цела,
добра ведаючы, што са смеццем –
і расставацца не шкода?
А з золатам?

***

Уладу любяць усе.
Але не ўсе ведаюць,
што гэта такое.
Улада Творцы –
над тым, што ён стварае, –
самая каштоўная,
самая недасягальная для тых,
хто мае проста ўладу.
Ці не таму Уладары –
такія непрыхільныя
да Творцаў?

* * *

Пытанні, на якія не трэба даваць
адказу, – птушкі.
Птушкі любяць волю.
І толькі тады ладзяць гнёзды.

ПАРАЛЕЛЬНО
КІНО

Паралельнае кіно –

1) творчая плынь у кінематографе, якая існавала паралельна агульнапрынятай канцэпцыі сацыялістычнага рэалізма, так бы мовіць, кіно нефармалаў;

2) паралельныя прамыя – згодна з тэорыяй Эўкліда – ніколі не перасякаюцца, аднак Лабачэўскі сцвярджаў іншае: гэта калі-небудзь здарыцца!

ЧАЛАВЕК Ў СВІТЦЫ ....

* * *

Ішоў па дарозе Чалавек ў світцы і натрапіў на Камень.

– Чаму ты ляжыш тут? – спытаў Чалавек ў світцы.

– Каб ты мяне падняў, – адказаў Камень.

– А нашто мне цябе падымаць?

– Дом збудуеш!

– А мне і так добра, ў гушчары. Забраўся ў нару – і спі. Аб твае бакі я толькі мазалі натру.

– Як хочаш, – буркнуў Камень і ўлёгся лацвей – каб не турбавалі дарэмна – па дробязях.

... І ЧАЛАВЕК У СМОКІНГУ

* * *

Чалавек у смокінгу ехаў па дарозе і натрапіў на Камень.
– Чаму ты ляжыш тут? – спытаў Чалавек у смокінгу.
– Каб ты мяне падняў, – адказаў Камень.
– І то праўда! Даўно пара, – сказаў Чалавек у смокінгу і, падняўшы камень, зашпурнуў яго як мага далей – на раллю. Толькі што ўзараную.

Чалавек у свiтцы зiрнуў на Сонца i спытаў:
– Сонца, а, Сонца! Чаму ты забралася так высака? Табе, мусiць,горача там?
– І не кажы! Пакуль усiх сагрэеш – упарышся!
– А ты апусцiся нiжэй, лэгчэй будзе, – параiў Сонцу Чалавек у свiтцы.
Сонца паслухалася... i зачырванела – куды вочы дзець ад сораму – ні цяпла, ні святла! – якое ж яно цяпер Сонца?!
– Авой-вой! – залямантаваў Чалавек у свiтцы.
– Што ты наробiла?! Вяртайся назад! Свяцi як раней!
– Э-э, брат! Нельга так! – адказала Сонца. – Цяпер чакай да заўтрага!

... Вось i чакае з той пары – свайго Сонечнага Заўтра!

Чалавек у смокінгу зірнуў на Сонца і спытаў:

– Сонца, а, Сонца! Чаму ты забралася так высака? І свеціш так ярка? Нашто?

– А мне так лепей усіх відаць, – прыжмурылася з вышыні Сонца.

– І мяне?

– І цябе.

Чалавек у смокінгу пачухаў патыліцу і спытаў:

– Ну, і як?

– Ніяк, – спакойна адказала Сонца. – Хадзі, жыві, радуйся... А я – свяціць буду – каб людзі не спатыкаліся.

Чалавек ў свiтцы iшоў па лесе i ўбачыў Жанчыну.

– Ты хто? – спытаў ён.

– Жонка твая.

– А ўжо ж! Хiба я цябе калi ведаў?!

– Ведаў цi не, але ж во сцацеў! Хiба не так?

– Бач ты, хiтрэнная якая! – хаваючы ўсмешку, пакруцiў вусы Чалавек ў свiтцы. – Ну а як жа цябе завуць?

– Жонка.

– Ты што – iмя свайго не маеш?

– А табе што трэба: iмя цi жонка?

Чалавек у смокінгу ехаў не машыне і ўбачыў Дзяўчыну.

– Ты хто? – спытаў яе Чалавек у смокінгу.

– Жонка твая, – усміхнулася Дзяўчына.

– Якая ж ты жонка?! Падрасці спачатку! Дзі-ця!

– Дзіця не дзіця, а справу сваю ведаю!

– Ну калі ведаеш, то сядай, – пасміхнуўся Чалавек у смокінгу і галантна схіліў перад ёй галаву.

А Дзяўчыне – таго і трэба: скок яму хуценька на шыю!

– Ого! – крэкнуў ад нечаканасці Чалавек у смокінгу.

– Я ж казала, што справу сваю ведаю, – зарагатала Дзяўчына і прыладзілася ямчэй – каб здалёк яе бачылі!

Чалавек у свiтцы ўбачыў Ружу i спытаў:
– Чаму ты такая калючая?
– Каб ты мяне мацней любiў.
– А хiба я цябе мала люблю?
– Сапраўднае каханне – гэта смерць! – сказала – як адрэзала! – i змоўкла.
Чалавек у свiтцы спынiўся, ступiў крок назад i болей ужо не падыходзiў да Ружы – пазiраў на яе толькi здалёк.

Чалавек у смокінгу зірнуў на Ружу і спытаў:

– Чаму пялёсткі твае такія пяшчотныя?

– Каб ты, убачыўшы іх, на ўсё забыўся і пакалоў рукі аб мае калючкі.

– А нашто гэта табе?

– Каб я ведала, што і ты – Чалавек.

– А хіба я не чалавек?

– Чалавек той, хто памірае ад кахання.

Чалавек у смокінгу падышоў да Ружы, абстрыг нажніцамі яе калючкі і без асабліваго клопату сарваў Ружу.

– Цяпер ты мая! – сказаў ён.

– Цяпер я не Ружа, – сумна прамовіла Прыгажуня і пялёсткі яе асыпаліся на дол.

– Хай бы ўжо дзеткі ў нас былі, – сказаў Жонцы Чалавек у світцы.

– Хай, – згадзілася Жонка. – А хто іх гадаваць будзе?

– Як накормім, то й самі ўзгадуюцца.

– Хіба што, – пагадзілася Жонка. – Дзеці ж – як семкі: кінуў у зямельку – і растуць... Адно – што семкі бацькоў сваіх не помняць...

– Хай бы ўжо дзеткі ў нас былі, – сказаў Дзяўчыне Чалавек у смокінгу.
– Пабойся Бога! Якія дзеткі?! Ці не сам казаў, што я – шчэ дзіця?!
– То злазь з шыі! – раззлаваўся Чалавек у смокінгу.
– Як адпішаш мне ўсё, што маеш, тады і злезу... Тады мо і дзетак можна...

... Дагэтуль на шыі сядзіць: і маёмасць адпісваць шкода, і куля – курву гэткую! – ані не бярэ!

Чалавек у свiтцы ўзяў кардонку i намаляваў на ёй хлеў, карову, авечак.

Хлеў быў стары, скасабочаны, авечкі – худыя i галодныя, а карова – з блакітнымі сумнымі вачыма. Яна ўзнялася над хлевам i лётала ў празрыста-сінім небе разам з белымі, як малако, аблокамі.

– А чаму твая карова лётае? – спыталі яго.

– А хіба ёй не хочацца хоць раз пабыць там, дзе мы бываем? – адказаў Чалавек у свiтцы i паставіў на кардонцы кароценькі подпіс– "Марк..."

Чалавек у смокінгу навыціскаў на халсціну розных фарбаў, потым зняў чаравік з рыфлёнай падэшвай і, каўзануўшы ёю па грудочках фарбы,настаўляў на палатне рознакаляровых адбіткаў сваіх рыфлёных слядоў. Тады прыляпіў у цэнтры недакурак "Мальбара" і, праткнуўшы цвічком тканіну, павесіў на яго самаробны, выкаваны з залатых талераў, тоненькі абадок, які блішчэў ярчэй фарбаў.

– Што гэта? – спыталі яго.

– Асацыятыўна-трансцэндэнтная адэкватнасць гіперадчувальнай экзістэнцыі пры наяўнасці недастатковай фіксацыі ўспрыймальна-разумовых вібрацый перцэптуальнай існасці індывіда.

Усе ажно ахнулі.

– І колькі гэта каштуе? – спыталі яны.

– Гэта не мае цаны, – стрымана і сціпла адказаў Чалавек у смокінгу, але вочы яго ўспыхнулі надзеяй: зараз яму назавуць сапраўдную цану.

Але людзі толькі пацяснулі плячыма:

– Няма – дык няма, што зробіш...

І разышліся...

– Чаму ты такі дурны? – спытала Жонка Чалавека ў свiтцы.
– А чаму ты так кажаш? – здзівіўся ён.
– А хіба не! Хутка зіма, а ты сядзіш, як доўбня, галаву ў неба задраўшы, нібыта адтуль і хлеб, і бульба пасыплюцца... Чаго ты чакаеш?
– Прышэсьце будзе, – пакорліва ўздыхнуўшы, сказаў Чалавек у свiтцы.
– Якое прышэсьце? – не сцяміла Жонка.
– Звычайнае! Прыйдуць і забяруць...
– Каго?
– Каго-каго?! Мяне!.. Ну, можа, і цябе – калі так жадаеш...
– Куды забяруць, авібок!
– Як куды?! У Рай! Ну, а цябе – ведама, у Пекла! За тое, што лаешся...
– Ой, уставай, даражэнькі, і бягом! Бягом!
– А куды?
– Як куды?! Да мяне!
– Ну, чаго шчэ?!
– Ды хіба ты аслеп?! Не бачыш дагэтуль, дзе твой Рай?!

– Чаму ты ў мяне такая разумная? – асцярожна спытаў Дзяўчыну Чалавек у смокінгу.
– Таму што на шыі сяджу. Хіба не здагадаўся яшчэ?!
– Здагадаўся! А як шыя не вытрымае – што тады?
– Хіба ты адзін на свеце?! – пасміхнулася Дзяўчына. – Ці доўга пераскочыць?!
– Пераскочыць не доўга, доўга злазіць...
– Чаму доўга?
– Бо зачэпішся!
– За што?
– Ды за тое, што цябе на шыі трымае...

Цяжка зрабілася Чалавеку ў світцы: грошай не плоцяць, поле не родзіць, Жонка праходу не дае:
– Калі ўжо мы па-людску жыць будзем?
Чалавек ў світцы плюнуў не ўсё – абуў стаптаныя лапці, сунуў пад паху пустую торбу – і пайшоў у Вярхоўны савет.
Адчыніў дзверы і сказаў:
– Я – Народны Фронт! Што вы мне дасцё?
– Пачакай трохі? Зараз дамо!
І – выспятка яму! Выспятка!

* * *

Тады Чалавек у світцы пайшоў у краму і выменяў торбу на смокінг.
Апрануў – зірк у люстэрка – і страх яго ўзяў:
– Хіба гэта я?!
– Канечне, ты! – запэўніла Люстэрка. – Ты ж ведаеш – я нікому не маю!
Чалавек у світцы супакоіўся, расправіў плечукі, падкруціў абкусаны вус і сказаў, любуючыся ў люстэрка:
– А хіба я не той, хто я ёсць?! – хіба не Чалавек у смокінгу?!

Тады Чалавек у смокінгу сеў у машыну і паехаў у Вярхоўны савет.
Адчыніў дзверы і сказаў;
– Я – камерсант. Я хачу гандляваць.
– Чым? – спыталі яго.
– Не чым, а кім! – дзелавіта ўдакладніў ён, ідучы да трыбуны.– І чым хутчэй, тым лепей!
І ўсе кінуліся навыперадкі – займаць чаргу.

* * *

Чалавек у смокінгу сеў у звычайны з выгляду "Мэрседэс" і паехаў.
Насупраць будынка строгай архітэктуры – велічнага і халоднага – ён вылез з "Мэрседэса", азірнуўся запытальна на рэдзенькіх прахожых і супакоіўся: ніхто з іх і не памкнуўся прызнаць у ім Чалавека ў світцы.

Ішоў па дарозе Чалавек у світцы і трапіў на могілкі.

– Што мне тут рабіць? – спытаў ён недаўменна.

– Адпачываць, – сказаў Камень.

– Не мітусіцца, – сказала Сонца.

– Не рабіць глупства, – сказала Жонка.

– Знайсці збавенне, – сказала Ружа.

– Не назаляць! – коратка пасміхнуўся Чалавек у смокінгу і зашпурнуў у пустую труну ўшчэнт зношаную зрэбную світку. Павярнуўся, сеў у машыну і паехаў – шукаць другія могілкі: гэтыя яму не спадабаліся.

TRACTATY

Трактат *(ад лац. tractatus – разгляд) – навуковая праца, у якой разглядаецца якое-небудзь асобнае пытанне ці праблема.*

Дыспут *(ад лац. disputo – спрачаюся) – публічная спрэчка на навуковыя, літаратурныя, маральныя і падобныя тэмы.*

ЦЫЛІНДРЫ

(трактат пра вечнасць)

1. Цыліндры ніколі не бываюць аднолькавымі. Адзін заўсёды большы, другі – меншы. Большых звычайна не відаць – яны не перад вокам. Заўважаюшца, як правіла, толькі меншыя.

2. Але і тыя, і другія маюць аднолькавыя якасці і аднолькавае прызначэнне: усярэдзіне іх знаходзяшца людзі.

3. Куды б чалавек ні ішоў – на працу, на пагулянку ці яшчэ куды – цыліндр разам з ім. Што б ні рабіў – таксама.

4. Цыліндр не перашкаджае дыхаць, спяваць, чалавашца, – чалавек проста не заўважае яго – сценкі цыліндра празрыстыя, як шкло, бязважкія, як лічбы ў ашчадной кніжцы, і неадчувальныя, як здароўе – калі яно ёсць.

5. Праз іх пранікае паветра, полымя, холад, мароз, – усё, што мае дачыненне да жышця, – і толькі адзінае, што мае дачыненне да жышця – чалавечыя думкі, – не могуць пераадолець нябачнай воку, бязважкай, але на дзіва трывалай паверхні сценак цыліндра. Думкі таго, хто знаходзіша ўсярэдзіне цыліндра.

6. А думкі звонку – усядно, як і гукі, – без перашкод пранікаюць праз яго празрыстыя сценкі, сутыкаючыся там з думкамі індывіда, які носіць на сабе гэты цыліндр.

7. Думкі, народжаныя ў выніку такога сутыкнення, тым не менш, губляюць здольнасць вырвацца за межы, пазначаныя цыліндрам, і робяцца прыналежнасцю і цыліндра і індывіда.

8. За той час, які праходзіць ад нараджэння індывіда да яго смерці, думак збіраецца столькі, што ім робіцца цесна ў цыліндры, і яны пераплятаюцца там, як вужы, альбо як карэнне ў занадта цесным вазончыку.

9. Вазончык можна памяняць, а цыліндр – не: ён даецца чалавеку адзін раз – пры нараджэнні, – і чалавек звычайна сам вызначае для сябе яго памеры: яшчэ не цямячы нічога – з першым глыткам паветра, з першым крыкам, – ужо ў той момант ён падсвядома ацэньвае свае сілы і рэдка калі памыляецца, а потым, зрабіўшыся дарослым, пакорліва нясе абраную ім ношу.

10. Чалавеку цёпла і ўтульна ўсярэдзіне цыліндра, гэтаксама, як цёпла і ўтульна чарапасе ў ейным панцыры. Але чарапаха высоўвае час ад часу галаву і ногі, а чалавек – не: яго гняце думка, што калі ён гэта зробіць, усе адразу ўбачаць, чаго ён варты.

11. Раз ці два за той прамежак часу, які адпушчаны чалавеку лёсам, яму даецца магчымасць памяняць свой цыліндр. Меншы на большы. Хто падрыхтаваны да гэтага і не пабаіцца страціць тое, што меў дагэтуль, – робіцца

вольным: сценкі цыліндра адсоўваюшца на тую адлегласць, якую вызначае ягоная смеласць. І калі смеласць небеспадстаўная – калі ў індывіда няма сумненняў наконт сваіх здольнасцяў і сілы, – чалавек можа памяняць цыліндр яшчэ раз і яшчэ раз...

12. Прашэс аднак не бясконцы: старэюць не думкі – старэе непадуладнае нам цела. А думкі – проста паўтараюшца.

13. Цыліндр, страшіўшы адно цела, набывае замест яго другое. Звычайна – маладзэйшае. Ці толькі што народжанае.

14. Цыліндры – вечныя. Імі – утыркана ўся Зямля. Яны– як іголкі ў вожыка – бароняць тое, што ім даражэй за ўсё: наша так лёгка ранімае цела і ў шмат разоў больш ранімую душу, якая – невядома чаму – прагне вечнасці.

САКРЭТ

(трактат пра каханне)

1. Каханне – гэта сакрэт.

2. Каханне – гэта таямніца.

3. Каханне – гэта тое, што ведама толькі табе.

4. Каханне – гэта тое, пра што на будзе ведаць ніхто, калі ты здолееш нікому не выдаць свой сакрэт – сакрэт таго, якое ж яно, тваё каханне.

5. Калі ты хочаш захаваць свой сарэт – не хавай яго – пакінь навідавоку, – і ніхто не здагадаецца, што гэта – твая таямніца.

6. Ягонай таямніцай была Венера Мілоская – маленькая мармуровая статуэтка – копія сапраўднай вялікай скульптуры – выявы статнай грэшкай прыгажуні з абабітымі рукамі і захінутай ніжэй пояса белым мармуровым покрывам. Безліч складак хавала ногі і тое, што не трэба было бачыць воку, але хавала так, што лёгка было здагадацца ці ўявіць тое, што было схавана. Невядомы творца быў, як бачыце, хітрун: не парушаючы канонаў, якія не дазвалялі пераступіць пэўныя межы, ён абышоў іх і сказаў тое, што хацеў сказаць.

7. Наш паважаны герой, які меў за таямніцу паменшаную копію гэтага шэдэўра, шторанішы прыходзіў

у сваю майстэрню, сядаў у глыбокае мяккае крэсла і праніклівым позіркам разглядаў статуэтку.

8. У гэтыя моманты ён думаў пра тое, што самае дасканалае ў свеце – гэта, безумоўна, чалавечае цела, і з прыемнасцю прыгадваў, што ў жонкі ягонай – яно таксама дасканалае – мяккае і пульхлае, – але як толькі ён гэта ўспамінаў, твар яго міжволі пахмурнеў, і ён з прыкрасцю адзначаў – якое ж яно недасканалае ў сваёй дасканаласці, – па сваёй ахвоце жонка ніколі не скідвала з сябе тое, у чым клалася спаць, і яму даводзілася рабіць гэта самому – а хіба гэта мужчынскі клопат?! – а часам нават зрываць з яе гэта апошняе, калі жонка ўпаршылася ці марудзіла, – а вось мармуровая – яна ніколі не ўпаршылася – яе можна было распранаць дзе хочаш і калі хочаш – у абед, пасля вячэры, нават зранку, калі жонкі не было дома.

9. І ён, седзячы ў сваім мяккім крэсле, займаўся якраз гэтым – пашіху развінаў белае мармуровае покрыва і ўважлівым нетаропкім позіркам разглядаў сцёгны, ногі, жывот, лашчыў іх сваім трошку прытуманеным позіркам, а потым, паставіўшы статуэтку трохі далей – на падстаўку, – браў фарбы і пачынаў пісаць тое, што ўбачыў толькі што, а потым, напісаўшы, прымазваўся да славы колішняга хітруна-стваральніка – апранаў напісаную на палатне жанчыну ў тое самае покрыва, хаваючы пад яго халоднымі мармуровымі складкамі стройнасць і пяшчотнасць ног – іх цяплыню і мяккасць – як

у жонкі, – і пакідаў аголеным толькі тое, што было аголена і без яго – плечы, грудзі, вабны жаночы стан...

10. Задаволены тым, што зрабіў гэта бездакорна, ён зноў пазіраў на скульптуру і трохі шкадаваў, што ў яе няма рук, якімі яна магла б абняць яго, але гэта з поспехам рабіла жонка, калі прыходзіла з працы, і ён адказваў ёй тым самым – прыхінаў да сябе і шаптаў ласкавыя пяшчотныя словы – і жонка верыла, што ён любіць толькі яе адну, а ён, цалуючы яе, быў упэўнены, што ніхто ў свеце не здагадаецца пра ягоны сакрэт – нават жонка, – не кажучы пра нас з вамі, шаноўныя спадары...

11. А нашто нам здагадваша, калі ў нас свае сакрэты, мо яшчэ больш патаемныя, чым у яго, – хіба не?!

12. Вы ж, напэўна, згодныя з тым, што каханне – гэта сакрэт?

13. І з тым, што каханне – гэта таямніца?

14. І, безумоўна, з тым, што каханне – гэта тое, што ведама толькі табе?

15. Бо яно і сапраўды непаўторнае, сапраўды таемнае і непрадказальнае – як і мы самі... дай нам Бог такога кахання!

Ф А К Т

(трактат пра мову)

1. Не трэба плакаць, што мова гіне.

2. Трэба стварацьна ёй шэдэўры.

3. І тады мова зробіша фактам, а ўсё, што вакол яе, – фікцыяй.

Ш Ч Ы Р А, Д Ы К Ш Ч Ы Р А!

(тактат пра чытача і пра аўтара)

1. Я – чытач(ка) – (непатрэбнае закрэсліць).

2. Мне да лямпачкі, колькі ты, аўтар(ка) – (адпаведнае падкрэсліць), – пашеў над тым, што я зараз чытаю.

3. Мне да лямпачкі і тое, колькі табе за гэта заплацілі (а) паўюткі мех грошай, б) дулю ў кішэні, в) на пачак цыгарэт ці на цукерку – нічога не закрэсліваць, бо ўсё магчыма). Да лямпачкі таму, што чытаеш не ты, а я, і мне за гэта ніхто не плоціць. Наадварот, плачу я, чытач. Плачу табе, аўтару (ці чорту лысаму, барадатаму, кульгаваму і г.д. – пакінуць тое, што болей да спадобы).

4. Ты пішаш для мяне, і мне не да лямпачкі, што ты там напішаш.

5. Ты пішаш нібыта і пра мяне, але ж я не такі дурны, як ты думаеш: я ведаю, што ты пішаш спачатку пра сябе, а потым ужо – нібыта пра мяне.

6. Значыша: я – гэта ты, а ты – гэта я?! Не-е, браце! Дурняў на свеце шмат, але я – не з гэткіх (з якіх – просьба не ўдакладняць!).

7. Зразумей адно: не будзе мяне – не будзе і цябе:

каму ты будзеш пісаць?!

8. Я – гэта лепшае з таго, што ты маеш: я ж цябе хвалю, пачытваю, а што часам лаю – дык на тваю ж карысць – каб не зазнаваўся!

9. А тое, што ты мне зараз напляшеш, нібыта ўсё, што я чытаю – прыдумка (праўда і г.д. – нічога не закрэсліваць!), – то гэта такая ж прыдумка і праўда, што я цябе ўвогуле чытаю.

10. Не верыш? Зірні на сваю кніжную паліцу! Там – Чэхаў, Талстой, Мапасан...

11. А на маёй?.. Хто – там?..

ДАЛІКАТНАСЦЬ

(тактат пра чалавека)

1. Знешнасць ніколі не адпавядае існасці.

2. Гэта зусім не азначае, што знешнасць – падманьвае.

3. Знашнасць – гэта тое, што мы носім на сабе. А існасць – гэта тое, што мы носім у сабе.

4. Што лягчэйшае: тое, што на сабе, ці тое, што ў сабе?

5. Лягчэйшае тое, што лёгка несці – сваё асабістае ўяўленне пра самога сябе.

6. Ці адпавядае яно існасці? І ісціне?

7. У каго як.

8. Адзін мой знаёмы – бачыліся з ім разоў пяць, не болей, – і не болей, чым па пяць хвілін, – заўсёды здзіўляў мяне неадпаведнасцю знешняга і ўнутранага. З выгляду – самы натуральны алкаш, праўда, з адценнем колішняй велічы і значнасці – не ягонай асабістай, а продкаў, якія здолелі перадаць яму праз – не высвятляў – колькі пакаленняў свой інтэлект, сваю духоўнасць, сваё разуменне жыцця і разуменне свайго абавязку перад іншымі людзьмі, а, значыцца, цалкам перад жыццём, якое яго нарадзіла, і ў якім ён мусіў існаваць.

9. Мы былі знаёмы павярхоўна – праз агульнага сябра, – але самі сябрамі не зрабіліся – да гэтага не дайшло – мелі

розныя жышёвыя інтарэсы – і толькі раскланьваліся пры сустрэчах. Менавіта раскланьваліся – віталіся без пошіскаў рук ці якіх іншых знакаў увагі.

10. Нейк мы сустрэліся гады праз два пасля апошняга нашага спаткання – зноў-такі выпадкова і зноў-такі – непрадбачана.

11. Мы ішлі з сябрам і сутыкнуліся раптам з чалавекам у не надта новым шэрым касюмчыку, з лямшаватай недагледжанай бародкай і незразумелымі вадзяністымі вачыма – ці то як у хворага, ці то як у пітка (ён і праўда ўжываў гэта зелле, але колькі ён прыняў у той ці іншы момант, здагадацца нельга было – гэта, так бы мовіць, быў яго звычайны стан – быць на падпітку, – настолькі звычка, якой ён і не пазбягаў, перайначыла тое, што ахвяравалі продкі).

12. Убачыўшы сябра, ён спыніўся і радасна пачаў расказваць пра тое, што яму ўдалося зрабіць, тады заўважыў мяне і павітаўся кіўком галавы, а потым – праз нейкі момант – пазнаў мяне і ўсміхнуўся – як чалавеку, з якім быў знаёмы, – але на большае не асмеліўся – мо таму, што я сам не надта хацеў гэтага – было трохі страшнавата набліжацца да яго ўскалмачанага твару, не зусім празрыстых і трохі касаватых вачэй – не хацелася ўлазіць у ягоны ўнутраны свет і разбурыць свой – мне неабходна было захаваць уражанне ад сустрэчы з сябрам – захаваць не толькі тое няўлоўнае, што ўзнікала пры кожнай нашай сустрэчы, але і думкі, выказаныя ім, а напружанне, якое не адпускала мяне апошнім часам на працягу цэлага тыдня, не дазваляла спадзявацца на сваю памяць,

якая магла раптоўна адмовіць – праз тае самае напружанне, – і таму я таксама толькі кіўнуў, і ён зразумеў мяне: два караблі розных флатылій і рознага водазмяшчэння прасігналілі адзін аднаму сваімі агнямі і разышліся – кожны сваім курсам, – і ўрэшце ён, дамовіўшыся з маім сябрам аб новай сустрэчы, развітаўся з ім – пошіскам рукі і ўдзячным спагадлівым позіркам.

13. Выканаўшы ўсе фармальнасці марскога суднаходства, карабель рушыў сваім курсам, але ў апошні момант выхапіў з шэраватага паўзмроку ружовага падпітку маю нерухомую постаць і прыпыніўся, хацеў быў вярнуша, ды штосьці яго спыніла, і ён, павагаўшыся, адно схіліў у паклоне галаву і толькі тады пайшоў, сутулячы плечы і хаваючы ад усіх свой твар: яму было соромна, што ён памкнуўся ісці, не развітаўшыся паперад са мной.

14. Мне таксама было соромна: праз тое, што не дазволіў яму павіташа са мной так, як ён павітаўся з сябрам, і кожны з нас нёс свой сорам так, як нясуць ношу, якую нельга скінуць, нельга перадаць другому – каб пазбавіша яе, – і якую нельга не данесці – да таго мейсца, адкуль пачынаеша чалавек.

РАТУНАК

(трактат пра тое, што баліць)

1. Кожнаму баліць сваё.

2. Кожэны ратуеша сам. Калі ўмее.

3. Калі не ўмее – шукае паратунку – у сяброў, у гарэлцы, у адзіноце.

4. Ад адзіноты няма паратунку, апроч сям'і.

5. Ад гарэлкі няма паратунку, калі няма сілы волі.

6. Паратунку ад сяброў шукаць не трэба – ім самім неабходна твая дапамога.

7. Выратуй сябра – і выратуеш сябе.

8. І тады не такая страшная будзе адзінота, не такой горкай – гарэлка, а сябры – знойдуць іншых сяброў – каб уратаваць і іх.

9. І калі ўратуюць – табе перастане балець тое, што так даўно баліць.

КАРОСТА

(трактат пра нацыю)

1. Нацыя – вымірае: Чарнобыль, дэмакратыя, блізкі саюз з Расеяй...

2. Хіба ад гэтага вымераюць?!

3. Нацыя – не вымірае: яна сябе выратоўвае – як і сто гадоў таму, і дзвесце – як і заўсёды, калі над ёй навісалі хмары – нацыя пачынала гуляць у хованкі.

4. Хованкі пачынаюша з выгнання: тыя, каго можна назваць беларусамі, жывуць не ў Беларусі – яны жывуць скрозь – у свеце.

5. Нацыя заўсёды бяднее на адну азінку, калі гэта Адзінка кідае Беларусь і едзе кудысь далёка – у белы свет.

6. Нацыя непазбежна багацее на Асобу, калі тая Адзінка – да сівых валасоў помніць рачулку, у якую некалі давала нырца, сцяжынку, па якой бегалі яе шпаркія ногі, родную хату з высокім комінам, у якой спалося так лёгка і бесклапотна.

7. Нацыя ўзвышаеша, калі перастае хваваша і пачынае бачыць у саміх сабе – у адзінках – Асобаў!

8. Нацыя ўзвысіша – калі ўсе Адзінкі збяруша разам – каб убачыць, хто яны, – і – калі гэта зробіша ясным,

яшчэ раз зірнуць на сваю хату і зноў – як і колісь! – паехаць у белы свет – бо на Радзіме – як заўсёды – шэрыя прыцемкі – шэрае будучае шэрага чалавека – у зношанай шэрай світцы, скінуць якую – боязна, скінуць якую – на даюць другія шэрыя людзі.

9. Шэрыя людзі нараджаюць светлых людзей са светлымі галовамі і светлымі душамі – невядома як, невядома чаму.

10. Шэрыя людзі ніколі не народзяць светлых людзей, калі пад шэрай світкай – шэрая душа.

11. Нацыя – не бедная. Яна – прадбачлівая: яна ведае, як ёй выжыць, і таму знарок носіць шэрую світку, знарок адпіхвае ад сябе тых, хто перашкодзіць ёй выжыць.

12. Вынаходнікі, мастакі і ўсе астатнія творцы – кароста на целе нацыі.

13. Кароста – захворванне, якое перадаецца пры блізкім кантакце.

14. Таму лепей – каб яна была як мага далей – хіба што ў белым свеце – і тады на яе можна пазіраць не як на небяспечнае і неадчэпнае захворванне, а як на незвычальную і невытлумачальную з'яву: на аллегласці – кароста перастае быць каростай і ператвараецца ў Боскую прыкмету – у струпы, з-пад якіх вырастаюць анёлавы крылы, якія робяцца затым гонарам нацыі.

15. І тады шэрыя людзі без боязі вяртаюць сабе каросту, праўда, не на твар ці рукі – толькі на вопратку!

– чапляюць ганаровыя ці юбілейныя значкі, каб ушанаваць тых, каго яны адправілі ў белы свет.

16. Хто вам сказаў, што нацыя – вымірае?! Яна сябе... беражэ!

ЯНО

(трактат пра назву)

1. Як назваць тое, чаго нельга назваць?

2. Як назваць тое, што добра ведаеш – тым самым словам ці другім – толькі што знойдзеным?

3. Словы – не каменне: не валяюцца пасярод дарогі без патрэбы.

4. Словы – птушкі: махне крылом – хіба зловіш?!

5. Лавіць словы – тое самае, што лавіць птушак.

6. Але – спаймаўшы, трэ выпускаць іх на волю – памруць.

7. Ды не патрымаўшы ў клетцы – не назавеш.

8. Душа – клетка ці ратунак ад клеткі?

9. Слова жыве доўга. Слова памірае імгненна, калі яно не тое.

10. Калі назавеш не так – заб'еш птушку, а душа ператворыцца ў клетку, у якой загінеш ты сам.

11. Як назваць тое, чаго нельга назваць?

12. Назва прыходзіць сама, калі душа твая – не клетка, а тое, чаго нельга назваць. Назваць так, як ты хацеў бы назваць, калі б ведаў хаця б адно птушынае слова.

УЦЁКІ

(трактат пра саломінку)

1. Саломінка – гэта тое, на чым можна пайграць – падудзець – падзьмуўшы ў яе – амаль як на жалейцы.

2. Саломінка – гэта тое , на чым расце зерне.

3. Саломінка – гэта тое, за што мы хапаемся, калі ўхапіша болей няма за што.

4. Саломінка – тонкая і нетрывалая, а надзея – шчэ танчэйшая.

5. Як адно ўтрымлівае другое?

6. Ці трымае не яно – не хісткае, а моцнае і надзейнае?

7. Хіба надзея – такая моцная?

8. Чым яе менеі – тым яна мацней.

9. Саломінка – наадварот – чым яна танчэйшая, тым больш хісткая і ломкая.

10. Надзея бывае рознай: апошняй, беспадстаўнай, дарэмнай.

11. Дарэмна шукаць там, дзе нічога не расце.

12. Самае ўразлівае месца – душа, а саломінка – гэта ўцёкі – уцёкі ад таго, ад чаго нельга ўцякчы – ад сябе.

13. Хіба ты такі шчаслівы, што хапаешся за адзінае,

што цябе трымае – за саломінку?!

14. Хіба не лепей жыць весела, лёгка, прыгожа – так, як жывуць усе?!

15. Ці мо не пашкадаваць часу і высветліць – якое ж яно ў цябе – тое самае ўрадлівае месца, – мо там даўно нешта расце, а калі не расце, то пасадзіць – хіба надзею! – і тады ўцёкі твае адразу зробяцца непатрэбнымі, а на саломінцы можна будзе пайграць – падудзець – як на вяселлі, альбо як тады, калі над галавой – сіняе неба, а табе – усяго гадкоў пяць ці шэсць, і калі ўцёкі – гэта тое, што чакае цябе наперадзе?

16. Уцёкі ад чаго? І куды?

КРОПКА

(трактат пра званок у дзверы)

1. Калі ты стукаеш у дзверы – ты хочаш трапіць туды, куды ішоў.

2. Калі табе не адчыняюць – там альбо – як жартавалі зусім нядаўна – п'юць каву, альбо там сапраўды нешта здарылася.

3. З маёй суседкай – цёткай Верай – ты сябравалі даўно – з таго самага часу, як я пераехаў у новы раён – па сутнасці не новы, а самы што ні на ёсць стары – старадаўні, кутузаўскі – з Петраграда, які для мяне асабіста пачынаўся адразу за Абводным каналам, дзе я раней жыў, у саменькі цэнтр – на бераг Нявы, – дзе насупраць – з аднаго боку прытулілася "Аўрора", а з другога – вартуе спакой горада стромкая , але і цяпер жывая Петрапаўлаўка.

4. Перасяленне было нечакана прыемным, прытым удвая: апроч непаўторнага краявіду, які радаваў вока і ніколі не надакучваў, мне пашанцавала і на суседзяў: не па кватэры, а па лесвічнай пляцоўцы – як падымаешся на другі паверх, то на левы бок – нашы дзверы, на правы – цёткі Веры.

5. Гэта цяпер яна для мяне цётка Вера. А тады – напачатку – была Верай Іванаўнай. Інтэлігентная, адукаваная – з ёй было прыемна пагутарыць заўжды – і за кубачкам кавы, і нават на нашай агульнай пляцоўцы.

6. Гадоў праз пяць пасля майго пераезду памёр яе муж, і цётка Вера засталася адна – з разведзенай дачкой і ўнучкай. Другі раз замуж яна не выходзіла, хаця прапаноў мела шмат.

7. Пашіху старэла, рабілася не такой бадзёрай, нават распаўнела – не ад добрага харчавання, а хутчэй ад напазбежных перамен у арганізме, – а сем гадоў таму – каб неяк зводзіць канцы з канцамі – набыла дачу – яшчэ за ранейшыя грошы – і ўсё лета прападала там, з'яўляючыся ў горад толькі на зіму.

8. Апошняй восенню часта хварэла, выгляд мела не надта здаровы, і я, размаўляючы з ёй, заўсёды хваляваўся – хоць бы яна не заўважала таго, што міжволі набягае на мой твар, калі я пазіраю на яе.

9. Але хвароба, дзякуй Богу, адступілася.

10. Неяк сярод зімы – бег дахаты і ўжо ў сваім двары дагнаў незнаёмую цётку – ні па адзежы не пазнаць, ні па хадзе. Параўняліся – дык гэта ж Кашярына! – дачка цёткі Веры! Я віташа, а яна ад мяне ўбок – нібыта спалохалася. Твар стомлены, спашелы.

– Што з вамі, Каця?

– Ды нічога. Хварэлі трошкі...

– Дык Вера Іванаўна тут?

– Таксама хварэла... Але вы заходзьце... Будзем рады...

– Дзякуй! Перадавайце ёй прывітанне...

11. Пакуль даставаў ключы, што завалiліся на самае дно торбы, Каця пазваніла ў дзверы і гучна , нараспеў, прамовіла:

– Мама, гэта я...

12. Пачуўся бразгат засаўкі, шчоўканне замка – дзверы расчыніліся – і я перадумаў адчыняць свае – лепей сам павітаюся з цёткай Верай.

13. Я не пазнаў яе – худзенькая, нават памаладзелая – яна была падобная на дзяўчынку, якая пражыла гадоў сто, але знешне – засталася дзяўчынкай: вочы паблісквалі жывым агнём, трохі ўзбуджаным і неспакойным, тонкія рысы твару сапраўды нагадвалі маладую дзяўчынку – я не ўтрымаўся і сказаў, як хораша яна выглядае.

14. – Праўда? – шчыра здзівілася яна.

– Праўда!

– Дзякуй вам! Заходзьце ў госці, даўно з вамі не бачыліся.

– З прыемнасцю, але толькі, калі можна, пазней – пад вечар?

– Якраз добра. Мы будзем чакаць.

15. Даўно настаў вечар, даўно прайшла дамоўленая гадзіна – а з іхняй кватэры не было чуваць ні гуку: тэлефон не адказваў, а званочак за дзвярыма слабенька дзынкаў, аднак ніхто не падыходзіў адчыніць.

16. Калі дзверы не адчыняюць – не, там не маглі пiць

каву – на каву цяпер не хапала грошай, – значыша, там...

17. Я не ведаў, што там... Я не мог болей званіць, не мог грукаць у дзверы – я быў збянтэжаны і не ўяўляў сабе, што там...

18. Я толькі ўспомніў, як цяжка дыхала Кацярына, ідучы дваром, як яна спалохалася, пачуўшы мае крокі...

19. Я прыгадаў надзіва малады твар цёткі Веры, трошачкі разгублены, трошачкі ўзбуджаны – але які прыгожы – і – прабачыць мяне Бог і людзі! – падумаў быў – ці не зрабілі яны там што-небудзь з сабой... Яны ж заўсёды адказвалі на мае званкі... Няўжо ім было не вытрываць і яны адважыліся на апошняе – каб спыніць пакуты...

20. І мне падалося, што цётка Вера ўжо тады, як убачыла мяне, ведала, што з ёй будзе праз некалькі хвілін або гадзін... І якраз праз гэта ў яе быў такі светлы, такі малады і прыгожы твар – прыгажэйшы, чым калі-небудзь яшчэ...

21. І я падумаў пра тое, што гэта зусім не страшна – калі ідзеш да гэтага моманту так, як ішла цётка Вера – верачы, што гэта і ёсць Збавенне... што гэта – Свята, якому няма роўных... што гэта тое – з чым можна ісці далей...

22. І гэта не заўсёды Кропка. Гэта – Працяг...

23. Я працягваю званіць і стукаць у дзверы:

– Цётка Вера! Адчыні! Гэта я!

ЧАЛАВЕКУ ЎЛАСЦІВА

(трактат пра Дарогу і пра Памылку)

1. Errare humanum est – чалавеку ўласціва памыляцца – сівярджалі ў старажытнасці. Сівярджаюць і цяпер.

2. Памыляцца трэба: на памылках вучацца – нават тыя, хто прымае самастойныя рашэнні.

3. Памыляцца – прыемна, асабліва на сваю карысць.

4. Памыляцца – недаравальна, калі за памылкаю ідзе бяда.

5. Памыляцца – неабходна: каб высветліць, дзе праўда, а дзе мана.

6. Хіба тое, што я пішу – праўда?

7. Праўду – ніхто не піша: яе берагуць – для сябе! – каб не памыліцца ў другі раз.

8. Мая праўда – ані не падобная на вашу, а ваша – на маю, але ваша праўда і мая праўда – у сукупнасці – якраз тое, чаго нам усім не хапае, каб ведаць што мы жывем праўдаю, а не маной.

9. Мана – супакойвае. Мана – прыемна лашчыць слых – ці не таму памыляцца – іншы раз так прыемна?! Асабліва тады, калі праўда – вастрэйшая за нож!

10. Мана – зашягвае – як пастка, як пятля, як вір, –

але манячы – не будзеш мець той асалоды, якую дае праўда – асалоду Волі!

11. Памылка – таксама мана – неўсвядомленая, выпадковая, абдуманая – якая робіша знарок.

12. Калі я пішу – я памыляюся знарок – знарок яўна, знарок відавочна! – каб вам адразу было відаць, што я памыляюся, каб вы, не доўга думаючы, – сказалі мне: "Браце! Не мані!"

13. І калі вы скажаце так – мне зробіша прыемна ад сваёй маны: я адразу ўбачу, што вы – разумнейшыя за мяне! што вы і самі – без мяне! – крочыце той дарогай, якая завеша Дарогай Праўды.

14. Але ж я – такі самы, як і вы, і мне таксама ўласціва...

15. Але я раблю гэта знарок!


пасля
таго
як
напісана

СУСТРЭЧА

1. Сустрэча – нечаканасць.

2. Сустрэча – прадчуванне.

3. Сустрэча належыць не нам – яна належыць тым, кім мы зробімся потым – калі сустрэнемся.

4. Ніхто не ведае тэрмін – гэта не так істотна.

5. Нічога дзіўнага ў тым, што вы будзеце потым – вас цяпер няма.

6. Гэтаксама, як і мяне.

7. Я прыйду – калі адыйду.

8. Вы прыйдзеце заўтра – потым.

9. Вам трэба есці, спаць, цалавацца – чакаць, калі настане потым – каб усё зразумець, спасцігнуць, прыняць.

10. Прымаць –цяжэй за ўсё.

11. Разумець – лёгка.

12. Спасцігаць – адно праз тое, што прыходзіць і прыйдзе само – без мяне – і пасля мяне: я – не сведка, я – люстэрка вашай хады.

13. Хада – праца, хада – пакуты, хада – радасць – калі бачыш, куды прыйшоў.

14. Прыйсці – проста – калі дарога – простая.

15. Прыйсці – немагчыма – калі ідзеш не ў той бок.

16. Не ісці – спыніцца. Калі гэта зручней і паўтараецца штодзень – то ўжо – есці, спаць, цалавацца...

17. Калі гэтага мала – настае часіна спазнаць, зразумець, прыстасавацца...

18. Адна часіна змяняе другую – укленчваць не трэба – усё робіцца само – па розуме.

19. Праз гэта – будзеце потым – вас цяпер няма – гэтаксама, як і мяне – у тым месцы, дзе толькі што былі вы.

20. Пачатак – канец шляху.

21. Канец шляху – тое, што будзе потым.

22. Мяняцца і мяняць месцамі – не трэба: кожны – і кожнае! – на сваім.

23. Тое, што будзе потым – Сустрэча.

24. Сустрэчы – нават жадаючы – не абмінуць!

25. Да Сустрэчы!

РАЗВІТАННЕ

1. Душа – гэта тое, чаго нельга назваць, – калі не ведаеш, як гэта зрабіць.

2. Каханне – першы крок да Сустрэчы – калі яно дазваляе табе ісці.

3. Каханне – ратунак, каханне – пагібель. Кахаеш толькі тады – калі бачыш далёка.

4. Каханне – саломінка, каханне – уцёкі, каханне – пачатак, каханне – непазбежнасць.

5. Уцёкі – радасць, калі ўцякаеш да сябе – да таго, які будзе потым.

6. Кропку ставіць не трэба – гэта зробяць іншыя – там, дзе спыняцца, – а ты – пойдзеш далей – калі пачуеш сілу – сілу ісці.

7. Кожнаму ўласціва сваё.
Кожнаму – адно і тое.
Кожнаму – як усім.
Памыляцца – не трэба.
Да Сустрэчы!

ЗМЕСТ

Раздзел першы:

Ноч пакутніка 5

Раздзел другі:

Пустыя гнёзды 21

Раздзел трэці:

Паралельнае кіно 41

Раздзел чацьвёрты:

Дыспут 61

Раздзел пяты:

P.S. 89

Літаратурна-мастацкае выданне

Кірвель Анатоль Мяфодзевіч

ЧАЛАВЕКУ ЎЛАСЦІВА

Вершы і мініяцюры ў прозе

Рэдактар К.А. Цвірка
Мастак М.Г. Васільеў
Кампутарны набор і арыгінал-макет
С.І. Санько, Інфармацыйна-рэкламная
служба «ISK»

АС

Падпісана да друку 06.08.96. Фармат 30х42 1/8.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Тыраж 300 экз. Зак. 3